РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Сцепанцоў А. І.,*** *прарэктар БелІПК*

# МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ І РЫНАК

Адукацыя пранізвае ўсю гісторыю развіцця чалавека і грамадства. Менавіта праз адукацыю ажыццяўляецца сувязь пакаленняў, чалавек далучаецца да духоўных і інтэлектуальных здабыткаў. Адукацыя фарміруе асобу ў адпаведнасці з дамініруючымі ў дадзеным грамадстве каштоўнасцямі і ідэаламі, інтарэсамі і мэтамі. Таму ва ўсе часы любая дзяржава праяўляе зацікаўленасць да развіцця адукацыі ў патрэбным ёй накірунку, абвяшчаючы адукацыю дзяржаўнай каштоўнасцю і прыярытэтам у сацыяльнай палітыцы.

Але паміж абвесткай і рэальнымі дзеяннямі дзяржавы існуе пэўная нестыкоўка. Мала абвесціць, трэба адбудаваць канкрэтны механізм падтрымкі прыярытэтнасці адукацыі. А гэта закранае фінансаванне, матэрыяльна-тэхнічнае, кадравае, прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне інстытутаў адукацыі і ў першую чаргу залежыць ад узроўню развіцця эка-

номікі, навукі, тэхнікі. Краіны традыцыйнай рынкавай эканомікі заўсёды аказвалі дзяржаўную падтрымку сістэме адукацыі і ўкладалі значныя грошы ў яе развіццё.

Сістэма адукацыі на Беларусі складвалася адначасова з будаўніцтвам дзяржаўнасці. Яна фарміравалася і развівалася ў рамках агульнай савецкай сістэмы адукацыі і поўнасцю знаходзілася на дзяржаўным забеспячэнні.

Адукацыя і грамадства непадзельныя. Гэта суцэльная сістэма. І любыя праблемы, з якімі сутыкаецца грамадства, соцыум, непазбежна адбіваюцца і на стане сферы адукацыі.

Ва ўмовах эканамічных цяжкасцей, падзення ўзроўню жыцця, пашырэння крыміналізацыі грамадства, нашэсця масавай культуры з выкарыстаннем не лепшых замежных прыкладаў праблемы адукацыі на Беларусі аказаліся адсунутымі на другі план і сталі для дзяржавы зусім не прыярытэтнымі.

Крызісныя з'явы ўпрамую закранулі адукацыю. Вось яго некаторыя праявы: значнае падзенне прэстыжу выкладчыцкай працы, нізкая аплата выкладчыкаў, пагаршэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы большасці навучальных устаноў, незапатрабаванасць маладых спецыялістаў.

Мастацкая адукацыя з'яўляецца арганічнай часткай агульнадзяржаўнай сістэмы адукацыі. Прадметы мастацкай адукацыі ўваходзяць у вучэбны план агульнаадукацыйнай школы і садзейнічаюць гарманізацыі ўсяго вучэбнага працэсу. Існуе таксама спецыялізаваная сістэма навучальных устаноў мастацтва з відавочнай спецыфікай, якая вызначаецца сутнасцю і патрабаваннямі сферы культуры. Навучальныя ўстановы рыхтуюць кадры для мастацкіх, музычных, харэаграфічных, тэатральных клубных калектываў, дзіцячых школ мастацтва.

Мастацкая адукацыя з'яўляецца крыніцай, якая жывіць культуру, абнаўляе яе, забяспечвае засваенне і распаўсюджванне мастацтва. Што ўяўляе сабою мастацкая адукацыя як сацыяльна-культурны інстытут падрыхтоўкі кадраў? Як на яго ўплывае рух грамадства да рынкавых адносін, ці дакладней, чаканне гэтага руху?

Каб лепш уявіць сучасны стан мастацкай прафесійнай адукацыі, зробім беглы гістарычны экскурс.

Вылучаючыся сваімі адметнасцю і спецыфікай, мастацкая адукацыя прайшла гістарычны шлях, уласцівы ўсёй нацыянальнай сістэме прафесійнай адукацыі. Відавочны наступныя этапы яе развіцця: 1) станаўленне; 2) удасканаленне структуры і зместу адукацыі; 3) інтэграцыя адукацыйных сістэм розных узроўняў; 4) фарміраванне новай канцэпцыі адкрытай сістэмы прафесійнай адукацыі.

Станаўленне, фарміраванне сістэмы прафесійнай адукацыі адбывалася у 1918—1940-х гг. У гэты перыяд развіваліся масавыя формы навучання ў вузкаспецыялізаваных адукацыйных установах. Да вайны былі адкрыты харэаграфічнае вучылішча ў Мінску, музычныя вучылішчы ў Мінску, Магілёве і Гомелі, культасветвучылішча ў Магілёве. У тыя гады да выкладання ў іх прыцягваліся вопытныя практыкі, а таксама дыпламаваныя спецы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ялісты, якія закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы Масквы, Санкт-Пецярбурга.

Масавы выпуск спецыялістаў дазволіў у кароткі тэрмін умацаваць музычныя прафесійныя калектывы, удасканаліць сістэму культурна-асветнай работы ў рэспубліцы, павялічыць колькасць прафесіяналаў-выкладчыкаў прадметаў мастацтва ў школах. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах закладаліся першапачатковыя прафесійныя навыкі, даваліся практычныя веды ў сферах мастацтва і культуры, фарміраваўся малады спецыяліст, здольны працягваць самаадукацыю, весці практычную самастойную працу. Выкладчыкі гэтых навучальных устаноў назапашвалі вопыт педагагічнай работы, што дазваляла ў далейшым выкарыстоўваць іх у новых вну.

Чатырнаццаць гадоў існавання сярэдняй спецыяльнай адукацыі лагічна прывялі да адкрыцця ў 1932 г. вышэйшай навучальнай установы — Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Першымі студэнтамі яе сталі выпускнікі музычных вучылішчаў краіны, а выкладчыкамі — работнікі Мінскага музычнага вучылішча. Вучэбны працэс гэтай вну быў пабудаваны па ўзору Маскоўскай і Пецярбургскай кансерваторый, выпускнікамі якіх былі большасць прафесараў Беларускай кансерваторыі. Першы выпуск музычнай вну прадэманстраваў высокую якасць падрыхтоўкі спецыялістаў: амаль усе яны потым папоўнілі выкладчыцкі склад кансерваторыі.

Удасканаленне структуры і зместу адукацыі адбывалася ў 1945—1985-я гг. Гэты час вызначаўся такімі падзеямі, як адкрыццё Беларускага тэатральнага інстытута (1945), яго мастацкага факультэта (1953), Мінскага інстытута культуры (1975). Апошняя вну забяспечыла падрыхтоўку спецыялістаў для самых розных відаў культасветустаноў. Белдзяржкансерваторыя разгарнула падрыхтоўку спецыялістаў па ўсіх музычных спецыяльнасцях. Была адкрыта студыя opernай падрыхтоўкі, якая рыхтавала вакалістаў да работы ў Дзяржаўным акадэмічным вялікім тэатры оперы і балета, у Тэатры музычнай камедыі.

Гэты перыяд вызначаўся далейшым развіццём элементаў непарыўнасці сістэмы прафесійнай адукацыі, масавым адкрыццём дзіцячых школ мастацтваў — пачатковых устаноў прафесійнай арыентацыі ў галінах мастацтва і культуры. Тры буйнейшыя вну рэспублікі забяспечвалі кадрамі тэатральна-відовішчныя прадпрыемствы, навучальныя ўстановы культуры, культурна-асветныя ўстановы. Рабіліся першыя крокі па стварэнню нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуры і асістэнтуры-стажыроўкі пры вну. Большая частка спецыялістаў для вну па-ранейшаму навучалася шляхам мэтавай падрыхтоўкі ў аспірантурах і асістэнтурах вну Масквы і Санкт-Пецярбурга.

У 1970 г. створаны Інстытут павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры — установа паслядыпломнай адукацыі спецыялістаў галіны.

Умацоўвалася сістэма сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў краіны, якую ў поўным аб'ёме забяспечвалі педагагічнымі кадрамі тры вышэйшыя навучальныя ўстановы мастацтва. У сваю чаргу, ССНУ з'яўляліся асновай для іх студэнцкага папаўнення.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На гэтым этапе працягвала захоўвацца дзяржаўнае фінансаванне сістэмы прафесійнай мастацкай адукацыі ў поўным аб'ёме. Толькі ў пачатковым звяне — школах мастацтваў усіх тыпаў — збіралася бацькоўская плата за навучанне дзіцяці, але яна не пакрывала і 10% расходаў дзяржавы на навучанне.

Такім чынам, сродкі дзяржаўнага бюджэта, якія паступалі ў сферу адукацыі, з'яўляліся практычна адзінай крыніцай фінансавых рэсурсаў навучальных установ.

Захоўвалася сістэма цэнтралізаванага саюзнага забеспячэння агульнымі навучальнымі планамі, праграмамі без уліку нацыянальнай і рэгіянальнай спецыфікі. Фактычна існаваў жорсткі стандарт навучання, які ўжо не адпавядаў патрабаванням часу. Але лепшыя ўзоры выкладання мастацтва выдатнымі выкладчыкамі прабіваліся скрозь рэгламентаваную сістэму саюзнай вучэбнай дакументацыі.

Інтэграцыя адукацыйных сістэм розных узроўняў пачала адбывацца з 1985 г. Яна адзначана дэмакратызацыяй прафесійнай адукацыі, пераходам да стварэння сістэмы непарыўнай прафесійнай адукацыі.

Фактычна стваралася сістэма поўнага кадравага самазабеспячэння галіны, якая і зараз, нягледзячы на значныя эканамічныя цяжкасці, здольная задавальняць усе асноўныя мастацка-культурныя запатрабаванні грамадства і эстэтычныя патрэбы людзей: навучанне мастацтву дзяцей, падлеткаў і моладзі; прафесіянальная мастацкая адукацыя; забеспячэнне патрэб прафесіянальных і самадзейных мастацкіх калектываў у выканаўцах і кіраўніках; падрыхтоўка і перападрыхтоўка, а таксама павышэнне кваліфікацыі кадраў культуры; фарміраванне прафесарска-выкладчыцкага корпуса; міждзяржаўныя мастацкія сувязі Беларусі і г.д. Пра гэта сведчаць поспехі маладых беларускіх прадстаўнікоў на міжнародных мастацкіх конкурсах, дасягненні нацыянальных школ балета, жывапісу, тэатра, актыўная творчая дзейнасць многіх вядомых майстроў беларускай культуры, у тым ліку народных артыстаў і мастакоў.

Спецыфіка падрыхтоўкі спецыяліста культуры праяўляецца ў скіраванасці на асаблівы аб'ект — мастацкую творчасць. І нават болей — гэта не проста скіраванасць, а выхаванне мастацкага светаадчування, уводзіны ў асаблівае жыццё (душэўнае, эмацыянальнае) — у мастацтве.

Справядлівым выглядае ўжо звыклы выраз: якія кадры — такая і культура. Сапраўды, здольнасць, кваліфікацыя, актыўнасць маладога спецыяліста ў многім вызначаюць стан і ўзровень функцыянавання ўстановы культуры, мастацкага калектыву. Менавіта будучыня мастацтва, культуры фарміруецца зараз у навучальных установах культуры.

Вось такая склалася сістэма мастацкай адукацыі: трохузроўневая і шматпрофільная. Але да 90-х гг. жорстка цэнтралізаваная, даволі ўстойлівая і падатлівая для кіравання і не зусім прыстасаваная для вольнага плавання.

У перыяд з 1991 па 1996 г. рэзка скараціліся дзяржаўныя асігнаванні, якія накіроўваліся на ўзнаўленне вучэбна-матэрыяльнай базы адукацыі, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым ліку, навучальных устаноў культуры. Пераход да рынкавых узаемаадносін суб'ектаў гаспадарання прымусіў навучальныя ўстановы шукаць дадатковыя крыніцы, каналы паступлення фінансавых сродкаў.

Аднак шматгадовае існаванне ў межах агульнадзяржаўнага размеркавальніка пэўным чынам разбэсціла кіраўнікоў навучальных устаноў. Ім не трэба было клапаціцца пра лёс установы: раней усё жорстка было зарэгламентавана, усё вырашалася зверху. А тут аб'явілі аб пераходзе да рынкавай эканомікі. Трэба было знаёміцца з прыватнай ініцыятывай і нават пранікацца духам свабоднага прадпрымальніцтва. І галоўнае — самому клапаціцца пра сваю ўстанову ў рамках агульнапрынятых правіл. Канешне, ранейшая звычка захавалася трывала—прасцей было стукацца ў дзяржаўныя органы кіравання, выбіваючы сабе дадатковыя сродкі. Але дзяржава пакінула за сабой фінансаванне ў асноўным зарплаты, стыпендый, камунальных паслуг і нязначна — падтрымкі матэрыяльна-тэхнічнай базы. І многія кіраўнікі сталі шукаць шляхі атрымання пазабюджэтных сродкаў і зарабляць самі.

Стала пашырацца пазабюджэтнае фінансаванне. Гэта плата грамадзян і прадпрыемстваў за навучанне, аплата здаваемых у арэнду памяшканняў і абсталявання, сродкі ад уласнай тэатральна-канцэртнай, выдавецкай дзейнасці, спонсарскія сродкі. Істотнымі з'яўляюцца сродкі, атрыманыя за навучанне замежных грамадзян.

У гэтыя гады высветлілася, што сістэма мастацкай прафесійнай адукацыі не такая ўжо і бездапаможная ва ўмовах руху да рынкавых адносін.

Узгадаем, што рынак — гэта сфера абмену як сістэма таварна-грашовых адносін вытворцаў і спажыўцоў матэрыяльных благ і паслуг. І аказваецца, што сістэма дзяржаўнай прафесійнай мастацкай адукацыі набывае ўжо і паняцце сферы адукацыйных паслуг.

Прадукт, які рыхтуюць установы мастацкай адукацыі, вельмі спецыфічны — гэта спецыялісты музыканты, харэографы, мастакі, рэжысёры. Яны маюць попыт і за мяжой.

Вялікі конкурс з боку моладзі на пэўныя спецыяльнасці мастацтва сведчыць аб яе зацікаўленасці і гатоўнасці вучыцца нават за плату. Але платнае навучанне развіваецца цяжка, таму што бацькі не могуць цягнуць гэтага цяжару больш аднаго-двух гадоў — вельмі нізкія заробкі ў насельніцтва. Вось лічбы навучэнцаў за ўласныя грошы: Універсітэт культуры — 14% кантынгенту, Акадэмія мастацтваў — 11, Акадэмія музыкі — 5, у асобных сярэдніх спецыяльных навучальных установах не перавышае 2%.

Канешне, асноўным спажыўцом па-ранейшаму застаецца дзяржава, яна і забяспечвае большую частку фінансавання з бюджэту. Так, у мінулым годзе бюджэт Універсітэта культуры склаў 331 млн. дэнамінаваных рублёў (самастойна зароблена трэць), Акадэміі мастацтваў — 127 млн. рублёў (самастойна зароблена пятая частка), Акадэміі музыкі — 244 млн. рублёў (самастойна зароблена чацвёртая частка). Значна меней зарабляюць сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, і асноўным паступленнем грошаў тут з'яўляецца здача ў арэнду памяшканняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адбываюцца змены ў сістэме паслядыпломнай адукацыі. Беларускі інстытут праблем культуры пачаў уводзіць (і плануе пашырэнне) платныя формы перападрыхтоўкі спецыялістаў культуры, а таксама павышэння кваліфікацыі. У сакавіку аб'яўлены набор выкладчыкаў, якія вядуць клас гітары ў дзіцячых школах мастацтваў, але маюць уласную адукацыю на ўзроўні азнаямлення ў музвучылішчы без прысваення адпаведнай кваліфікацыі. Пасля дзесяцімесячнага курса навучання пройдзе кваліфікацыйны экзамен і па яго выніках будзе выдадзены адпаведны дыплом дзяржаўнага ўзору.

Аб'яўлены і выклікаў цікавасць набор у Школу фалькларыста — гэта таксама платная перападрыхтоўка для практыкаў — кіраўнікоў фальклорных ансамбляў.

Відавочна, што жыццё застаўляе навучальныя ўстановы ўводзіць і пашыраць платныя формы навучання ў адпаведнасці з існуючым вопытам. Гэта таксама дазваляе больш выкарыстоўваць магчымасці выкладчыкаў навучальных устаноў у пашырэнні аб'ёмаў выкладання, а значыць, — і ў павялічэнні ўзроўню іх даходаў.

Падабагульняючы, можна сказаць, што сістэма дзяржаўнай адукацыі ў галіне культуры вытрымала выпрабаванне бягучага дзесяцігоддзя і прадэманстравала пэўную жыццеўстойлівасць у складаных умовах цяперашняга жыцця. Ва ўмовах жорсткага фінансавага абмежавання ўдалося ажыццявіць галоўнае — захаваць навукова-творчы і педагагічны патэнцыял навучальных устаноў галіны, утрымаць ад скарачэння сетку навучальных устаноў.

Аднак шматгадовае чаканне зрухаў у эканоміцы краіны са спадзяваннямі на аднаўленне дзяржаўных датацый у памерах, якія б маглі забяспечыць далейшае развіццё сістэмы мастацкай адукацыі, і рэальнае жорсткае абмежаванне дзяржаўнага фінансавання вычарпалі амаль усе ўнутраныя назапашаныя раней рэсурсы навучальных устаноў. Скажам так, рух спыніўся. І каб пазбегнуць магчымых страт, неабходны значныя фінансавыя ўкладанні дзяржавы. Тут прамая сувязь з тэрмінамі выздараўлення эканомікі. Незалежна ад таго, якая стратэгія сацыяльна-эканамічнага развіцця будзе абрана ў рэспубліцы, дзяржаве не абыйсціся без падтрымкі сферы адукацыі, бо толькі праз адукацыю магчыма забяспечыць высокі ўзровень кампетэнтнасці, ведаў і ўменняў, высокі ўзровень прафесіяналізму ў спалучэнні з інавацыйнымі тэхналогіямі. А гэта ў сваю чаргу дасць магчымасць нашаму грамадству перайсці да новай цывілізаванай стадыі і цывілізаванага рынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ